**Ляонаў, В.** Хадзілі мы паходамі / В. Ляонаў // Ленінская іскра (Сянно). – 1974. – 29 чэрв. – С. 3.

## ХАДЗІЛІ МЫ ПАХОДАМІ

У перыяд баявой дзейнасці Сенненская партызанекая брыгада базіравалася ў Прыветкаўскім, Хаўчанскім, Стаўпецкім і іншых лясах, а з лета 1942 года атрады размяшчаліся па сельскіх населеных нунктах раёна. Брыгада расла і папаўнялася баявым саставам і ўзбраеннем штодзённа, і да пачатку 1943 года ў яе радах налічвалася каля трох тысяч узброеных партызан. Баявыя дзеянні сталі насіць сістэматычны характар, і боепрыпасаў, якімі мы папаўняліся за лік разгрому ворага, стала не хапаць. Тады перад намі стала пытанне аб стварэнні аэрадрома, каб дадаткова атрымліваць боепрыпасы з Вялікай зямлі. Папярэдне звязаўшыся са штабам беларускага партызанскага руху, мы рашылі адваяваць у праціўніка даваенны аэрадром, які знаходзіўся ў раёне Беліцы. А для гэтага перш за ўсё трэба было разграміць Беліцкі гарнізон і блакіраваць бліжэйшыя варожыя гарнізоны.

У верасні 1943 года Беліцкі гарнізон быў блакіраван, а затым і разгромлен. У пачатку кастрычніка народныя мсціўцы пачалі прымаць самалёты з Вялікай зямлі. Фашысцкае камандаванне гэта ўстрывожыла. І хутка яно прыняло рашэнне: любой цаной выбіць нас з Беліцы. І зноў баі...

З дня арганізацыі і да поўнага выгнання фашыстаў з Беларусі брыгада не пакідала раёна і толькі выходзіла ў іншыя раёны на разгром варожых гарнізонаў і правядзення дыверсій. Са студзеня 1944 года з мэтай правядзення буйных баявых дзеянняў і адпору праводзімых нямецкім камандаваннем карных экспедыцый супраць партызан і насельніцтва была створана Сенненская партызанская зона, у якую ўваходзілі Сенненская, першая і другая Заслонаўскія, брыгады Дубава, Гуткова, Нарчука, Прахарэнкі, Дз'ячкова.

У 1944 годзе нашы савецкія войскі планавалі прарыў нямецка-фашысцкай абароны ў раёне Гарадка Віцебскай вобласці. Партызанскім брыгадам у парадку ўзаемадзеяння было дадзена заданне: расчысціць тыл, заняць гарады Лепель, Чашнікі, Бешанковічы і разграміць Свячанскі гарнізон. Адпаведна распрацаванага плана, групай нашых брыгад мы ўдарылі адначасова па праціўніку з трох бакоў і ў першы ж дзень выйшлі ў цэнтр горада. На працягу трох дзён ішлі ўпартыя баі за Лепель, а на чацвёрты атрымалі загад: пакінуць горад і адысці. У хуткасці брыгада атрымала загад: прайсці ланцуг варожых гарнізонаў, выйсці ў бок Ушацкай зоны і дапамагчы партызанскім злучэнням Лабанка, якія вялі жорсткія баі з праціўнікам. Выкананне гэтага загаду я ўсклаў на свайго памочніка Ванцеева. У саставе да тысячы добра ўзброеных партызан ён пад покрывам ночы прайшоў без бою некалькі гарнізонаў ворага і падышоў да буйных гарнізонаў, якія размяшчаліся ў вёсках Матырына і Залессе. Ванцееў прыняў такое рашэнне: за гадзіну-другую да заходу сонца пастроіў партызан паўзводна і маршам накіраваўся ў гэтыя гарнізоны. Немцы прынялі іх за паліцэйскіх і, нічога не падазраючы, упусцілі ў размяшчэнне гарнізонаў. Як толькі партызаны ўвайшлі, пачаўся бой, вельмі жорсткі. Гарнізоны былі разгромлены, захоплены вялікія трафеі, каштоўныя дакументы фашысцкага штаба.

Нас бамбілі штодзённа па 30 і больш самалётаў, накіроўвалі супраць нас танкі і бронетранспарцёры, буйныя злучэнні рэгулярнай арміі. Мы вымушайы былі адыходзіць на балоты. Танкам і бронетранспарцёрам тут праходу не было, а з жывой сілай ворага мы вялі жорсткія баі і

трымалі іх у такім напружанні больш двух месяцаў, прыкоўваючы да сябе значныя варожыя сілы. Арганізоўвалі рад шурмаў-прарываў, рабілі ўсё магчымае, каб злучыцца з наступаючымі часцямі Савецкай Арміі. Гэты жаданы час настаў у 20-х чыслах чэрвеня 1944 года, але яшчэ не была закончана наша ўзброеная барацьба. Часцям Савецкай Арміі дапамаглі ачышчаць лясы і дабіваць праціўніка, які застаўся ў акружэнні.

**В. ЛЯОНАЎ,**

былы камандзір Сенненскай партызанскай брыгады